АБРАД ЗАКРЫЦЦЯ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА
Ў МЯСЦОВЫХ КАСЦЁЛАХ

28 снежня 2025 года
Свята Святой Сям'і: Езуса, Марыі і Юзафа

Тэкст падрыхтаваны
Камісіяй Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры ККББ

«Цэлебрацыя закрыцця Юбілейнага года ў форме Эўхарыстыі з'яўляецца адзінай і праводзіцца ў катэдральным касцёле. Аднак, калі ў дыяцэзіі, адпаведна кананічнаму праву, ёсць конкатэдральны касцёл, ён таксама можа служыць месцам правядзення цэлебрацыі закрыцця. Для цэлебрацыі ў конкатэдральным касцёле дыяцэзіяльны біскуп можа быць заменены на свайго спецыяльна прызначанага дэлегата. Забараняецца праводзіць цэлебрацыйныя мерапрыемствы закрыцця ў іншых касцёлах дыяцэзіі, уключаючы санктуарыі або вызначаныя юбілейныя касцёлы» (п.2.)

УСТУПНЫЯ АБРАДЫ

Выкарыстоўваецца імшальны фармуляр: Святой Сям'і: Езуса, Марыі і Юзафа.

10. У прызначаны час вернікі збіраюцца ў катэдральным касцёле. Пасля таго, як збярэцца народ, уваходзяць біскуп, канцэлебранты і дыяканы, апранутыя ў літургічнае адзенне белага колеру. У гэты час выконваецца юбілейны гімн або іншы адпаведны спеў.

11. Біскуп, ушанаваўшы і акадзіўшы алтар звычайным чынам, ідзе да катэдры і кажа:
У імя Айца і Сына, і Духа Святога.

Народ адказвае:
Амэн.

Затым біскуп вітае людзей такімі словамі:
Бог надзеі,
які напаўняе нас усялякай радасцю і спакоем у веры
сілай Духа Святога,
няхай будзе з усімі вамі.

Народ адказвае:
І з духам тваім.

12. Біскуп пачынае цэлебрацыю наступнымі словамі:
Браты і сёстры,
мы разам пражылі Юбілейны год
(і дасягнулі яго кульмінацыі ў дыяцэзіяльнай пілігрымцы ў Рым).
Як адзіны народ, мы ўзнеслі хвалу,
падзяку і малітву да Бога
ў еднасці з тымі, хто ў свеце не мае голасу,
але каго Айцец чуе і прымае як умілаваных сыноў і дачок:
з хворымі, старымі, вязнямі, беднымі.

Праз юбілейны адпуст
Пан праліў раку ласкі і благаслаўлення.
Ён даў нам усім сваю надзею і свой спакой;
Ён умацаваў слабыя рукі і зрабіў моцнымі слабыя калені;
Ён сказаў кожнаму з нас: «Будзьце адважнымі, не бойцеся!»
Умацаваныя гэтым досведам міласэрнасці
і ўзмоцненыя нашай сустрэчай з Ім,
сёння мы, дыяцэзіяльная супольнасць пастыраў і народу,
святкуючы святасць Сям'і з Назарэта,
жадаем падзякаваць у Эўхарыстыі
і зноў папрасіць прабачэння, прызнаючы, што мы грэшнікі.

Пасля хвіліны маўчання дыякан або іншы прыслугоўваючы спявае наступныя заклікі:

Пане, Ты абуджаеш нашу веру, змілуйся над намі.
Н.: Пане, змілуйся над намі.

Хрыстэ, Ты натхняеш нашу надзею, змілуйся над намі.
Н.: Хрыстэ, змілуйся над намі.

Пане, Ты распальваеш нашу любоў, змілуйся над намі.
Н.: Пане, змілуйся над намі.

Або:

Пане, Сыне Божы, які праз нараджэнне ад Дзевы Марыі
стаў нашым братам, змілуйся над намі.

Н.: Пане, змілуйся над намі.

Хрыстэ, Сыне Чалавечы, Ты ведаеш і разумееш нашу слабасць, змілуйся над намі.

Н.: Хрыстэ, змілуйся над намі.

Пане, адзінародны Сыне Айца, які аб'ядноўваеш нас у адну сям'ю, змілуйся над намі.

Н.: Пане, змілуйся над намі.

Біскуп завяршае:

Няхай змілуецца над намі Бог усемагутны і,
адпусціўшы нам грахі, давядзе нас да жыцця вечнага.

Н.: Амэн.

Спяваецца гімн Хвала на вышынях Богу.
Імша працягваецца як звычайна.

МАЛІТВА ВЕРНІКАЎ

13. Пасля гаміліі і хвіліны маўчання спяваецца або чытаецца Сімвал веры.
Далей ідзе Малітва вернікаў з выкарыстаннем гэтых або іншых заклікаў:

Браты і сёстры,
пасля таго, як мы выслухалі слова збаўлення,
узнясём малітву нашу да Айца праз Сына.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Дыякан або лектар:

Молімся за Касцёл

Пасля хвіліны маўчання лектар чытае:

Няхай Касцёл, захавальнік плана збаўлення, абвяшчае ўсім словам і справай веру ва ўваскрослага Пана.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Дыякан або лектар:

Молімся за ўвесь свет

Пасля хвіліны маўчання лектар чытае:

Няхай свет, прыцягнуты любоўю ўцелаўлёнага Слова, супраціўляецца сутыкненню зброі і замест гэтага імкнецца да гармоніі і спакою.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Дыякан або лектар:

Молімся за тых, хто пакутуе

Пасля хвіліны маўчання лектар чытае:

Няхай тыя, хто пакутуе, не ўпадаюць у роспач, але спазнаюць у сваіх сэрцах дар хрысціянскай надзеі.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Дыякан або лектар:

Молімся за сем’і

Пасля хвіліны маўчання ыні лектар чытае:

Няхай сем’і па прыкладзе Святой Сям’і з Назарэта будуць чулымі да Божага плана, які кожны дзень кліча іх жыць у любові.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Дыякан або лектар:

Молімся за дыяцэзіяльную супольнасць

Пасля хвіліны маўчання лектар чытае:

Умацаваная сілай прабачэння
і адноўленая ласкай Юбілейнага года,
няхай наша дыяцэзія працягвае крочыць у святле Евангелля.
Н.: О Божа, наша надзея, пачуй нас.

Біскуп завяршае, кажучы:
Божа, наш Ойча,
у гэты Юбілейны год
Ты адкрыў для свайго Касцёла шлях збаўлення
і напоўніў сваіх сыноў і дачок надзеяй,
якая паходзіць ад Цябе.
Прымі нашыя добрыя намеры
і нашае жаданне вярнуцца да Цябе,
каб мы маглі быць сапраўднымі сведкамі Евангелля.
Дзякуючы ласцы Духа Святога,
накіруй нашы крокі да благаслаўлёнай надзеі
ўбачыць Тваё аблічча ў нябесным Ерузалеме,
дзе Тваё Валадарства дасягне сваёй дасканалай паўнаты
і ўсё будзе здзейснена ў Хрысце, Тваім Сыне.
Які жыве і валадарыць з Табой і Духам Святым на векі вечныя.
Н.: Амэн.

АБРАД КАМУНІІ

14. Біскуп пачынае малітву Ойча наш, якая спяваецца. Затым ён спявае эмбалізм Збаў нас, Пане. Народ адказвае, спяваючы акламацыю Бо Тваё Валадарства.

ГІМН ПАДЗЯКІ

15. Пасля Малітвы пасля камуніі біскуп пачынае гімн падзякі наступнымі словамі:
Браты і сёстры,
на заканчэнне Юбілейнага года
мы аб’ядноўваем нашы галасы са спевам усяго Касцёла,
які сёння ўзносіць падзяку Богу за дар Яго прабачэння.
Праз сакрамэнты, пілігрымку, малітву і міласціну
мы глыбока адчулі Божую міласэрнасць:
Пан змыў нашы грахі і напоўніў нас сваёй ласкай.
На працягу гэтага года, падчас літургічнага цыклу цэлебрацый,
мы цалкам увайшлі ў таямніцу Хрыста ў веры, надзеі і любові.
Цяпер, узмоцненыя досведам навяртання,
вернемся да штодзённага жыцця.
Як вучні, якія бачылі Яго твар,
Будзем трымацца радасці сустрэчы з Панам
і будзем цвёрда вызнаваць сваю надзею,
бо Ён верны сваім абяцанням.

Спяваецца гмін Цябе, Бога, праслаўляем або іншы гімн падзякі.

МАЛІТВА НАД НАРОДАМ

16. Пасля заканчэння гімна біскуп, з распасцёртымі над народам рукамі, моліцца:

Божа, наш Ойча,
няхай паўната Тваёй ласкі
і багацце Тваіх святых дароў
сыдзе на гэтую Тваю сям'ю:
дай сваім верным веру, якая перасоўвае горы,
і надзею, якая не расчароўвае,
і любоў, цярплівую і добрую,
каб, ніколі не адлучаючыся ад Тваёй волі,
яны маглі дзякаваць Табе за Твае бясконцыя даброты.
Праз Хрыста, Пана нашага.

Н.: Амэн.

Або:

УРАЧЫСТАЕ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ

17. Пасля заканчэння гімна біскуп удзяляе ўрачыстае благаслаўленне:

Няхай Айцец, які паслаў свайго Сына не судзіць свет, але выратаваць яго, * ахоўвае вас ад усялякага зла і падтрымлівае вашае жаданне дабра.

Н.: Амэн.

Няхай Сын, які паклікаў да сябе абцяжараных і прыгнечаных, † адорыць вас абнаўленнем і супакоем, * каб вы з даверам чакалі Яго вяртання напрыканцы часоў.

Н.: Амэн.

Няхай Дух Святы, які ў гэты Юбілейны год напоўніў вас ласкай, * дасць вам магчымасць кожны дзень жыцця дзейнічаць паводле таго, што вы спазналі ў веры.

Н.: Амэн.

Благаслаўленне ўсемагутнага Бога, Айца † і Сына, † і Духа Святога † няхай сыдзе на вас і застанецца назаўсёды.

Н.: Амэн.

18. Дыякан на рассыланне народа кажа:

Праслаўляйце Пана ў сэрцах вашых,
заўсёды гатовыя адказаць таму,
хто пытаецца пра крыніцу вашай надзеі.
Ідзіце ў супакоі.

Н.: Дзякуем Богу.